**STUDIA WSCHODNIOSŁOWIAŃSKIE** TOM 20, ROK 2020

*Ганна Мезенка*
DOI 10.15290/sw.2020.20.17
Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»
Філалагічны факультэт
Кафедра агульнага і рускага мовазнаўства
tel.: +375 212 58 96 73
e-mail: mezenka1@yandex.ru
ORCID ID: https://orcid.org/0000–0002–5192–767X

# Штрыхі да «ўрбананімнага партрэта» аднаго беларускага горада

**Ключавыя словы**: гадонім, намінатар, прынцып намінацыі, урбананімікон, "урбананімны партрэт"

У сучаснай славянскай анамастыцы з'яўляецца параўнальна мала абагульняльных супастаўляльных даследаванняў, адсутнасць якіх асабліва адбіваецца на развіцці тых яе зон, якія паўнавартасна сфарміраваліся толькі ў апошнія дзесяцігоддзі XX ст. Адной з іх з'яўляецца ўрбананіміка і ў прыватнасці падабенства і адрозненні "ўрбананімных партрэтаў" розных гарадоў Славіі.

Звычайна пад партрэтам (ад фр. portrait) разумеюць выяву або апісанне якога-небудзь чалавека альбо групы людзей, якія існуюць ці існавалі ў рэальнай рэчаіснасці, у тым ліку мастацкімі сродкамі (жывапісу, графікі, гравюры, скульптуры, фатаграфіі, паліграфіі, відэа), а таксама ў літаратуры і крыміналістыцы (славесны партрэт) [Портрет].

Своеасаблівы "ўрбананімны партрэт" уяўляе сабой пэўная сукупнасць найменняў вуліц, завулкаў, праспектаў і г.д., іншымі словамі, урбананімікон, схоплены ў пэўнае імгненне або час. Дарэчы, менавіта ён з'яўляецца адным з важных захавальнікаў культурна-гістарычных традыцый. Захаванню і развіццю духоўнай спадчыны Беларусі,

прапагандзе нацыянальных культурных традыцый, паказу іх узаемасувязі са славянскімі вытокамі і з сённяшнім днём спрыяе рэалізацыя асноўнай ідэі Дзён беларускага пісьменства – дзяржаўнага свята, якое адзначаецца з 1994 года і за гэты час набыло агульнанацыянальны статус.

Вядома, што складаннем "урбананімных партрэтаў" да гэтага часу мала хто спецыяльна займаўся[1].

Пры гэтым перафразуючы вядомы фразеалагізм, можна адзначыць: «Скажы мне, які ў гэтага населенага пункта "ўрбананімны партрэт", і я скажу, што ён уяўляе сабой».

З цягам часу адны са штрыхоў партрэта губляюць фарбы, іншыя ж – наадварот, толькі пачынаюць з'яўляцца.

Мэта даследавання – выяўленне адрозных штрыхоў "урбананімнага партрэта" аднаго з гістарычных цэнтраў культуры, беларускага горада Слоніма, які ў 2019 г. стаў месцам правядзення XXVI Дзён беларускага пісьменства.

Матэрыялам для працы паслужылі дадзеныя Дзяржаўнага кадастравага агентцтва Рэспублікі Беларусь, існуючых інтэрнэт-даведнікаў.

Выкарыстаны дэскрыптыўны, супастаўляльны, арэальны метады, элементы статыстычнага аналізу.

Галоўнымі рысамі ўрбананімнага партрэта былі і застаюцца прынцыпы намінацыі вуліц, завулкаў, праспектаў, трактаў і г.д., іншымі словамі, асноўныя напрамкі, па якіх ажыццяўляецца сувязь наймення з унутрыгарадскім аб'ектам. Трэба адзначыць, што ў апошні час гэтыя напрамкі наогул сыходзяць з арэны абследавання, нават у традыцыйных падыходах вывучэння, якія ўжываюцца ў адносінах да іх: структурным, лексіка-семантычным, этымалагічным. Нельга не пагадзіцца з І.А. Кюршуновай, што "без класічнага аналізу, які дазваляе ўбачыць ва іменніку сістэму, спосабы, матывы, прынцыпы намінацыі, дастаткова цяжка пабудаваць поліпарадыгмальнае вывучэнне" анамастыч-

[1] Так, у верасні 2019 г. у матэрыялах XVII Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Ономастика Поволжья" з'явіўся невялічкі артыкул Т.В. Шмялёвай "Анамастычны партрэт горада як мадэль інтэгральнага апісання" [Szmielowa 2019, 112–117], дзе прапануецца мадэль апісання гарадской анамастыкі, якая прадстаўлена як анамастычны партрэт горада. Мадэль ўключае тры кампаненты: апісанне гарадскіх імёнаў асобных фрагментаў гарадской прасторы (харонімы, гадонімы і г. д.); лінгвістычнае апісанне гарадскіх імёнаў у плане іх часавых і стылістычных характарыстык; апісанне гарадскога анамастыкону як полікодавага феномену. Эфектыўнасць прапанаванай мадэлі паказаная на матэрыяле аднаго са старажытных расійскіх гарадоў – Вялікага Ноўгарада.

ных адзінак, зафіксаваных ва ўрбананіміконах пэўнага гістарычнага перыяду [Kiurzhunowa 2019, 73].

Аналіз каля 100 урбананіміконаў беларускіх, польскіх, расійскіх, украінскіх гарадоў XVI–XXI стст. дазволіў вылучыць чатыры прынцыпы намінацыі ўнутрыгарадскіх тапаграфічных абъектаў. Тры з іх характарызуюць урбананімію пачынаючы з XVI ст. Гэта намінацыя аб'екта па адносінах да іншага значнага аб'екта; намінацыя аб'екта па ўласцівых яму прыкметах і якасцях; намінацыя аб'екта па сувязі з чалавекам як сацыясуб'ектам.

Чацвёрты прынцып намінацыі – па сувязі аб'екта з абстрактным паняццем – пачаў складвацца напрыканцы XVIII ст.

Назвы кожнага з адзначаных прынцыпаў існуюць ва ўрбананіміконе сучаснага Слоніма. Цікава прасачыць, як складваўся іх лёс у гісторыі горада.

Першыя звесткі пра назвы вуліц Слоніма, якія нам удалося адшукаць, датуюцца 1662 г. [CDGA Lit.]. Па дадзеных архіўнай крыніцы, у другой палове XVII ст. у горадзе функцыянавала 15 назваў вуліц, якія адпавядалі двум з пералічаных прынцыпаў. **Як і ва ўсіх астатніх беларускіх паселішчах таго часу, вядучым быў прынцып намінацыі аб'екта па адносінах да іншых аб'ектаў**, што ўзгадняецца з асноўнай функцыяй урбанонімаў – быць адрасам. У Слоніме на долю гадонімаў, якія адпавядаюць гэтаму прынцыпу намінацыі, па нашых падліках, прыходзілася 73,3% ад агульнай колькасці назваў лінейных аб'ектаў.

Аналізаваны прынцып намінацыі ажыццяўляўся ў асноўным праз дзве прыкметы: прыкмету, што характарызавала размяшчэнне вуліцы, завулка, плошчы і г.д. адносна іншых аб'ектаў (напрыклад, назвай *Ul. Spasska*[2] стала найменне размешчанай на ёй Спаскай царквы, на месцы якой у 2010 г. быў пабудаваны і асвечаны новы Спаса-Праабражэнскі кафедральны сабор; назва *Ul. Mikolska* ўзыходзіць да назвы Мікольскай царквы, назва *Ul. Zamkowa* матывавана найменнем размешчанага на ёй замка), прыкмету, што падкрэслівае сувязь аднаго аб'екта (вуліцы, плошчы і г.д.) з іншым (населеным пунктам, напрыклад: *Ul. Sokołowska* ← ад н.п. Сакалова; *Ul. Myszka* ← ад н.п. Мыш; *Ul. Panasowska* ← ад н.п Панасаўка; *Ul. Grzybowska* ← ад н.п. Грыбава), і прыкмету, у адпаведнасці з якой указваецца прасторавы арыенцір: *Uleczka zmostu*, *Uleczka z Uliczki Myskaei.* Аналізуючы тагачасныя

[2] Назвы прыводзяцца ў арфаграфіі крыніц, у якіх яны адзначаны.

назвы, разумееш, што гэта была ўжо даволі развітая ўрбананімная сістэма. Параўнаем: *ul. Druga Berezecka Bernardynska.*

У XVIII ст. гэтую групу назваў папоўнілі *ul. Klecka*, *ul. Skrobowska*, *Студенская ул.*, *Рожанская ул.*, *Uleczka zmostu* ператварылася ў *ul. Mostowu* (*Мостовую ул.*), хаця агульная працэнтная колькасць іх знізілася.

На працягу XIX–XX стст. адбывалася пашырэнне дыяпазону аналізаваных найменняў за кошт урбанонімаў, што ўказваюць на сувязь лінейнага аб'екта з іншым геаграфічным аб'ектам – горадам, ракой, борам і інш. Так, у Слоніме з'явіліся *Брестская ул.*, *Виленская ул.*, *Волковысский пер.*, *Гродненская ул.*, *Жировичский пер.*, *Зельвенский пер.*, *ул. Скубышевка* і інш.

Да гэтай групы далучаецца невялікая колькасць урбанонімаў, матываваных найменнямі вучэбных, лячэбных, спартыўных, прамысловых, гандлёвых аб'ектаў: *Аптечный пер.*, *Вокзальная ул.*, *Железнодорожная ул.*, *Заводской пер.*, *Кирпичная ул.*, *Оперная ул.*, *Пороховая ул.*, *Слесарный пер.*, *Спортивный пер.*, *Торговая ул.*, *Фабричная ул.*, *Физкультурная ул.*, *Школьная ул.*

Аналізаваная прыкмета з'яўляецца асноватворнай і ў групе найменняў, што паўтараюць назвы іншых унутрыгарадскіх аб'ектаў. Найперш у яе ўваходзяць назвы завулкаў, праездаў, тупікоў, размешчаных побач з аднайменнай вуліцай: *Барановичская ул.*, *Барановичский пер.*, *Боровая ул.*, *Боровой пер.*, *Ботаническая ул.*, *Ботанический пер.*, *Волгоградская ул.*, *Волгоградский пер.*, *ул. Коссовский Тракт*, *пер. Коссовский Тракт*, *ул. Минский Тракт*, *пер. Минский Тракт*, *ул. Панасовка*, *пер. Панасовка*, *Ружанская ул.*, *Ружанский пер.*

Гэтай прыкметай валодаюць і так званыя нумарныя назвы. Парадкавы нумар, з'яўляючыся асноўным адрознівальным элементам такіх назваў, у той жа час вызначае месца названага аб'екта сярод іншых, што паўтараюць назву вуліцы ці завулка, якая паслужыла "кропкай адліку для нумарных назваў", параўн.: *1-й Барановичский пер.*, *1-я Береговая ул.*, *2-я Береговая ул.*, *1-я Западная ул.*, *2-я Западная ул.*, *3-я Западная ул.*, *1-й Нагорный пер.*, *2-й Нагорный пер.*, *3-й Нагорный пер.*, *4-й Нагорный пер.*, *5-й Нагорный пер.*, *1-й Подлесный пер.*, *2-й Подлесный пер.*, *1-й Приречный пер.*, *2-й Приречный пер.*, *1-й Текстильный пер.*, *2-й Текстильный пер.*, *1-й Лесной пер.*, *2-й Лесной пер.*, *ул. 1-й Переезд*, *ул. 2-й Переезд*, *ул. 3-й Переезд*, *ул. 4-й Переезд*, *ул. 5-й Переезд*, *ул. 6-й Переезд*, *ул. 7-й Переезд.*

Да гэтай групы прымыкае даволі значная колькасць назваў з галоўнай прыкметай, якая характарызуе размяшчэнне вуліцы адносна

прыродных аб'ктаў: *Подгорная ул.*, *Подлесная ул.*, *Заречная ул.*, *Приречная ул.*, *Набережный пер.*

З пэўнай доляй умоўнасці гэту прыкмету можна ўбачыць і ў невялікай групе найменняў, матываваных размяшчэннем адносна бакоў свету: *Восточная ул.*, *Западная ул.*, *Южная ул.*, *Южный пер.*

Пры гэтым увогуле XXI ст. характарызуецца прыкметным зніжэннем дзеяння дадзенага прынцыпа намінацыі вуліц (параўнаем: XVI ст. – 73,3%; XVIII ст. – 55,6%; XXI ст. – 34,4%).

**Другую пазіцыю ў XVII ст. займалі назвы выліц, што адпавядалі прынцыпу намінацыі па сувязі з чалавекам як сацыясуб'ектам.** На іх долю ў адзначаным годзе прыходзілася чатыры адзінкі (26,7%). Менавіта чалавечая дзейнасць дыктавала ўрбанонімам свае патрабаванні – асноўнымі прыкметамі пры называнні ўнутрыгарадскіх аб'ектаў станавіліся нацыянальная або прафесійная прыналежнасць жыхароў гэтых вуліц: *ul. Zydowska*, *ul. Szwiecka*, *ul. Charbarska*, *ul. Berezecka-Rybacka.*

XVIII стагоддзе папоўніла гэту групу ўрбонімаў новымі адзінкамі, зафіксаванымі інвентарамі горада 1754 і 1796 гг. Акрамя ўжо названых, у дадзеную групу ўвайшлі *ul. Rybacka*, *ul. Tatarska*, *ul. Rzeznicka* (апошні гадонім мог узнікнуць ад назвы прафесіі жыхара – *рэзнік* 'мяснік' або ад назы аб'екта (*рэзніца* 'бойня ці мясныя рады'), размешчанага на вуліцы).

Мяркуем, што да гэтай групы могуць быць аднесены і назвы вуліц, матываваныя найменнямі асоб як прадстаўнікоў пэўнай агульнасці людзей, што асабліва актыўна пачалі з'яўляцца ў слонімскай урбананіміі ў XX ст.: *Гвардейская ул.*, *ул. Декабристов*, *Колхозная ул.*, *Коммунальная ул.*, *Комсомольская ул.*, *ул. Космонавтов*, *Красноармейская ул.*, *ул. Красных Партизан*, *пер. Красных Партизан*, *ул. Мелиораторов*, *пер. Мелиораторов*, *Молодежная ул.*, *ул. Новоселов*, *ул. Новаторов*, *Пионерский пер.*, *ул. Служащих*, *ул. Советских Пограничников*, *пер. Советский Пограничников*, *ул. Строителей*, *пер. Строителей*, *Студенческая ул.*, *ул. Танкистов*, *ул. Энтузиастов.*

Што да назваў мемарыяльнага характару, то ў Слоніме XVI–XVIII стст. іх не зафіксавана, чаго не скажаш пра XX ст., якое прынесла з сабой дзясяткі назваў-прысвячэнняў. З першага дзесяцігоддзя XX ст. да цяперашняга часу колькасць такіх найменняў вуліц павялічылася і склала 82 адзінкі. Аднымі з першых у горадзе з'явіліся назвы мемарыяльнага характару ў гонар заснавальнікаў навуковага камунізму, савецкіх дыпламатаў, выбітных чыноўнікаў, дзяржаўных

дзеячаў, затым удзельнікаў міжнароднага руху, удзельнікаў барацьбы за савецкую ўладу: *ул. Карла Маркса*, *ул. Ленина*, *ул. Войкова*, *пер. Войкова*, *ул. Дзержинского*, *ул. Калинина*, *пер. Калинина*, *ул. Кирова*, *ул. Куйбышева*, *ул. Мориса Тореза*, *пер. Мориса Тореза*, *ул. Павлика Морозова.*

Па меры росту горада арсенал матывіровачных сем пашыраўся за кошт а) імён знакамітых паэтаў і пісьменнікаў, палітычных дзеячаў і дзеячаў культуры: беларускіх і польскіх – *ул. Богушевича*, *ул. Максима Богдановича*, *ул. Мицкевича*, *ул. Франциска Скорины*, *ул. Огинского*; рускіх – *ул. Гоголя*, *ул. Достоевского*, *ул. Лермонтова*, *ул. Максима Горького*, *ул. Маяковского*, *ул. Некрасова*, *ул. Островского*, *пер. Островского*, *ул. Пушкина*, *пер. Пушкина*, *ул. Толстого*, *пер. Толстого*, *ул. Тургенева*, *ул. Якуба Коласа*, *пер. Якуба Коласа*, *ул. Янки Купалы*;

б) пасля 17 Верасня 1939 г, а асабліва па заканчэнні Вялікай Айчыннай вайны – імён удзельнікаў рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі і партыйнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, савецкіх военачальнікаў і радавых салдат, што прымалі ўдзел у вызваленні населеных пунктаў Беларусі: *ул. Анищика*, *ул. Веры Хоружей*, *ул. Добрияна*, *ул. Ершова*, *ул. Ковалевского*, *пер. Ковалевского*, *ул. Король*, *пер. Король*, *ул. Мирошника*, *пер. Мирошника*, *ул. Плетницкого*, *ул. Плиева*, *пер. Плиева*, *ул. Тавлая; ул. Владимира Белько*, *ул. Виноградова*, *ул. Гастелло*, *ул. Гнидаша*, *ул. Головского*, *ул. К. Давыдюк*, *ул. Заслонова*, *ул. Карбышева*, *ул. В. Крайнего*, *ул. Леошени*, *пер. Леошени*, *ул. Синичкина*, *пер. Синичкина*, *ул. Хлюпина*, *ул. Черняховского*, *ул. Чкалова*, *ул. Тугаринова; ул. Багратиона*, *пер. Багратиона*, *ул. Доватора*, *ул. Котовского*, *ул. Кутузова*, *ул. Лазо*, *ул. Суворова*, *ул. Чапаева*, *ул. Щорса*, *пер. Щорса*;

в) пачынаючы з 1960-х гадоў – за кошт імён вядомых вучоных, канструктараў, касманаўтаў: *ул. Королева*, *ул. Ломоносова*, *ул. Менделеева*, *ул. Мичурина*, *пер. Мичурина*, *ул. Тимирязева*, *ул. Циолковского ул. Гагарина.*

Разглядаючы групы ўрбанонімаў, што фіксуюць пэўныя адносіны да тых ці іншых асоб, неабходна адзначыць, што сярод назваў, якія адпавядаюць прынцыпу намінацыі па сувязі ўнутрыгарадского аб'екта з чалавекам, дакладна вызначаецца яшчэ адна група ўрбанонімаў, што пачала фарміравацца напачатку XX стагоддзя, – назвы, асновай намінацыі якіх паслужыла гістарычная падзея або знамянальная дата. Першыя назвы гэтай групы з'явіліся як раз у гарадах Заходняй Беларусі. Адразу пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР з'яўляюцца

найменні, матываваныя назвамі святаў рабочай салідарнасці і святаў, звязаных з перамогай Кастрычніцкай рэвалюцыі: *ул. 17 Сентября*, *ул. 1-й Семилетки*, *ул. 70 лет Октября*, *ул. 8 Марта*, *Октябрьская ул.*, *Октябрьский пер.*, *Первомайская ул.*

У другой палове XX ст. да іх далучаюцца назвы ў гонар перамогі савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны: *ул. Победы.*

Пашырана пачалі выкарыстоўвацца назвы, што прысвойваліся лінейным аб’ектам у азнаменаванне юбілеяў краіны ці грамадскай арганізацыі: *ул. 50 лет ВЛКСМ*, *пер. 50 лет ВЛКСМ*, *Юбилейная ул.*, *Юбилейный пер.*

Вяртаючыся да размовы пра гісторыю фарміравання слонімскай урбананіміі, адзначым, што заўважныя змены ў выкарыстанні прынцыпаў намінацыі вуліц горада адбыліся яшчэ ў XVIII ст. Нягледзячы на тое, што два галоўныя з іх у гэтым стагоддзі застаюцца вызначальнымі пры намінацыі ўнутрыгарадскіх лінейных аб’ектаў, доля іх ва ўрбананіміконе горада пачынае змяншацца за кошт з’яўлення **назваў, дадзеных па знешніх прыкметах самога лінейнага аб’екта. Гэта наступны па частаце ўжывання (трэці) ў межах слонімскай урбананіміі прынцып намінацыі**.

У залежнасці ад прыкметы, пакладзенай у аснову намінацыі, уся разнастайнасць назваў вуліц, што адпавядаюць названаму прынцыпу намінацыі, размяркоўваецца па наступных групах.

Самымі старажытнымі з іх у слонімскай урбананіміі былі назвы, што характарызавалі ўнутрыгарадскі аб’ект з боку канфігурацыі, памеру, фізіка–геаграфічных асаблівасцей узнікнення. Так, у 1754 г. у горадзе функцыянаваў *zaułek Krzywy*, у 1796 г. зафіксавана *ул. Брежна*, гэта значыць “пракладзеная ўздоўж берага”.

У наш час колькасць назваў аналізаванай групы прыкметна вырасла, хаця набор матывавальных прыкмет той самы, што і ў папярэднія стагоддзі: *Долгий пер.*, *Короткий пер.*, *Мокрый пер.*, *Песчаная ул.*, *Речная ул.*, *Крыничная ул.*, *Луговая ул.*, *Полевая ул.*

Асобную групу складаюць назвы, што характарызуюць лінейны аб’ект з боку часу існавання, або ўзросту, тыпу *Новый пер.*

Умоўна да назваў вуліц, завулкаў, што адпавядаюць прынцыпу намінацыі ўнутрыгарадскога аб’екта па яго ўласцівасцях і якасцях, можна прылічыць таксама эмацыянальна-характаралагічныя найменні. Адзінкі гэтай групы адлюстроўваюць сувязь унутрыгарадскога аб’екта з эмацыянальным уздзеяннем, якое выклікаецца асаблівасцямі і якасцямі дэталяў самога аб’екта. Гэта *Тихий пер.*, *Солнечная ул.*, *Солнечный пер.*, *Веселая ул.*, *Звездная ул.*

Яшчэ адну групу ў межах назваў, што адпавядаюць прынцыпу намінацыі ўнутрыгарадскога аб'екта па іх уласцівасцях і якасцях, складаюць найменні, якія маюць у сваім складзе словы са значэннем колеру. Пры гэтым неабходна зазначыць, што сувязь у гэтай групы назваў з названым прынцыпам найперш умоўная, паколькі колеравыя прыметнікі ў межах урбананіміі вельмі рэдка нясуць колеравыя значэнні. На розныя зыходныя адметна-назыўныя прыкметы паказваюць ва ўрбананіміі прыметнік *зялёны*. Акрамя рэальнага зялёнага колеру, ён у складзе ўнутрыгарадскіх назваў (*Зелёная ул.*) падкрэслівае багацце насаджэнняў.

Не столькі колеравае значэнне, колькі цікавасць да жывапісных назваў праяўляецца ва ўрбананіміі ў прыметнікаў *бэзавы*, *блакітны*. Прыкладам могуць служыць назвы: *Сиреневая ул.*, *Лазурная ул.*, *Лазурный пер.*

Адраджэнню цікавасці да жывапісных назваў абавязана яшчэ адна група ўрбанонімаў, што адпавядаюць прынцыпу намінацыі па ўласцівасцях і якасцях, – фларыстычныя.

Гадонімы па агульным характары расліннага ландшафту або асобным відам расліннасці сустракаюцца ў сучасным Слоніме: *Вишневый пер.*, *Каштановая ул.*, *Ольховая ул.*, *Ромашковая ул.*, *Садовая ул.*, *Сосновый пер.*, *Тополевая ул.*, *Тополевый пер.*, *Цветочный пер.*

У наш час урбананіміконы ці не кожнага беларускага горада ўключаюць назвы, у аснову намінацыі якіх пакладзены назвы флоры.

**Самым маладым сярод прынцыпаў намінацыі ўнутрыгарадскіх тапаграфічных аб'ектаў з'яўляецца прынцып намінацыі па сувязі аб'екта з абстрактным паняццем.** У беларускіх гарадах ён пачаў фарміравацца ў другой палове XIX ст. Прыцягненне слоў з абстрактным значэннем для іменавання вуліц, плошчаў, асобных будынкаў вельмі хутка пашыралася. Па нашых дадзеных, у канцы XX ст. агульная колькасць назваў лінейных аб'ектаў, што адпавядаюць гэтаму прынцыпу намінацыі, у 12,2 раза перавысіла іх колькасць, якая існавала ў XIX ст. Галоўная прычына такога "ўзлёту" аналізаванага прынцыпу – экстралінгвістычны фактар: Кастрычніцкая рэвалюцыя выклікала да жыцця выкарыстанне ў якасці назваў лінейных аб'ектаў слоў, звязаных з абстрактнымі паняццямі.

У першае дзесяцігоддзе XXI ст. асноўную групу ўрбанонімаў, што адпавядаюць гэтаму прынцыпу намінацыі, фарміруюць назвы вуліц і завулкаў, асновай намінацыі якіх сталі галоўныя сімвалы сацыялістычнай эпохі: *Советская ул.*, *Советский пер.*, *Социалистиче-*

*ская ул.*, *Социалистический пер.*, *Коммунистическая ул.*, *Интернациональная ул.*, *ул. Мира*, *ул. Свободы* – назвы, якія ёсць у кожным беларускім паселішчы.

Да гэтай групы далучаюцца таксама назвы, матываваныя найменнямі пораў года (*Весенняя ул.*), сімвалаў адзінства, незалежнасці, добрасуседскіх адносін (*Вольный пер.*, *ул. Независимости*, *ул. Воссоединения*, *пер. Воссоединения*, *ул. Дружбы*), мараў пра будучыню і маладосць (*ул. Будущего*, *ул. Юности*).

Такім чынам, ва ўрбананіміцы партрэт – гэта пэўным чынам сфарміраваная сукупнасць уласных імёнаў унутрыгарадскіх аб'ектаў, якая сведчыць пра ідэйнае стаўленне да іх намінатараў, карыстальнікаў і гасцей горада.

Кожнае з паселішчаў мае свой "партрэт", складзены з назваў яго аб'ектаў, дзякуючы якому, адрозніваецца ад іншых.

У працэсе стварэння і станаўлення слонімскай урбананіміі ўдзельнічалі чатыры прынцыпы намінацыі: па адносінах да іншага аб'екта, па сувязі ўнутрыгарадскога аб'екта з чалавекам, па прыродных уласцівасцях і якасцях лінейнага аб'екта, па сувязі з абстрактным паняццем. Галоўнымі штрыхамі, што адрозніваюць "ўрбананімны партрэт" Слоніма ў гэтых адносінах ад іншых беларускіх гарадоў, з'яўляецца тое, што ў самым пачатку фарміравання ўрбананімікона вядучым быў практычна адзін, першы прынцып намінацыі, на долю якога ў XVII ст. прыходзілася 73,3% ад агульнай колькасці назваў (на другі – 26,7%). Трэці прынцып пачаў фарміравацца толькі ў XVIII ст., а чацвёрты – ў XX ст. (Гл. табліцу 1).

**Табліца 1.** Прынцыпы намінацыі ва ўрбананіміі г. Слоніма

| | Прынцыпы намінацыі | XVII ст. 1662 г. | XVIII ст. 1754 г. + 1796 г. | XX ст. 1933 г. | XXI ст. 2016 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Па адносінах да іншага аб'екта | 11 – 73,3% | 10 – 55,6% | 49 – 52,1% | 55 – 21,5% |
| 2. | Па сувязі з чалавекам | 4 – 26,7% | 3 – 16,7% | 24 – 25,5% | 119 – 46,5% |
| 3. | Па прыродных уласцівасцях і якасцях лінейнага аб'екта | – | 5 – 27,7% | 18 – 19,2% | 64 – 25,0% |
| 4. | Па сувязі з абстрактным паняццем | – | – | 3 – 3,2% | 18 – 7,0% |
| Разам | | 15 | 18 | 94 | 256 |

Яшчэ адзін штрых, што адрознівае аналізаваны "ўрбананімны партрэт", – перавага назваў, матываваных імёнамі знакамітых паэтаў і пісьменнікаў, палітычных дзеячаў і дзеячаў культуры, над усімі ін-

шымі: з 82 адантрапанімных найменняў вуліц на гэтыя ўрбанонімы прыпадае 50%, або 41 адзінка.

Пажадана, каб распачатая на беларускім і рускім матэрыялах праца па стварэнні ўрбананімных партрэтаў была падхоплена польскім і іншымі славянскімі даследчыкамі, што дапаможа захаваць вобразы розных паселішчаў Славіі, што дэманструюць featnaбаковы духоўны свет гараджан, і дазволіць прасачыць гістарычныя вобразы эпох, маральныя і этнічныя каштоўнасці.

## Літаратура

Партрэт / Электронны рэсурс // Рэжым доступу (вольны). URL: http://www.ru.wikipedia.org. – Дата звароту: 15.04.2019.

CDGA Lit. [ЦДГА Літ., ф. ДА, адз.з. 3765, ч. 2, л. 96].

Kiurzhunowa I.A., 2019, *Nowyje podhody w issledowanji onomasticheskich materialow*, [w:] *Onomastika Powolzhja*, Wielikij Nowgorod. [Кюршунова И.А., 2019, *Новые подходы в исследовании ономастических материалов*, Великий Новгород.]

Szmielowa T.W., 2019, *Onomasticheskij portret goroda kak model integralnogo opisanija*, [v:] *Onomastika Powolzhja*, Wielikij Nowgorod. [Шмелева Т.В., 2019, *Ономастический портрет города как модель интегрального описания*, Великий Новгород].

## Крыніцы

Назвы вуліцаў і завулкаў горада Слоніма / Электронны рэсурс // Рэжым доступу (вольны), [online], https://govorim.by/grodnenskaya-oblast/slonim/stati-o-slonime/33779-nazvy-vulcau-zavulkau-gorada-slonma.html.

Улицы, улицы, карта Слонима / Электронны рэсурс // Рэжым доступу (вольны), [online], https://map.by/streets/Slonim.

## Скарачэнні

Стст. – стагоддзі.

ЦДГА Літ. – Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Літоўскай Рэспублікі.

# STROKES TO THE "URBANONYMOUS PORTRAIT" OF A BELARUSIAN CITY

ABSTRACT
**Key words**: gadonym, naminatar, principle of nomination, urbananimikon, "urbananymy portrait"

The article draws attention to the fact that relatively few summarising comparative studies appear in modern Slavic onomastics. Their absence particularly affects development of those zones of onomastics that became completely formed only in the last decades of the 20th century. One of such zones is urbanonymy and, particularly, the similarities and differences between "urbanonimic portraits" of different cities of Slavia. The article argues that in urbanonymy a portrait is a set of proper names of intracity objects, which has been formed in a certain way, that testifies to the ideological attitude to their nominators, users and visitors of the city. It is emphasized that each of the settlements has its own "portrait" made up of the names of its objects, due to which it differs from others. The article reveals distinctive features of the "urbanonymous portrait" of one of the historical centres of culture, the Belarusian city Slonim, which in 2019 became the venue for the XXVI Days of Belarusian writing.